# ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ У ЛЮСТЭРКУ АДЗІНОТЫ: ТРЫПЦІХ "СТАХ" БАРЫСА ПЯТРОВІЧА

**А.У.Андрэева**

Чалавек асуджаны на адзіноту. Ён прыходзіць у гэты свет, каб адчуць, спазнаць усе адценні гэтага стану. Цяжка дакладна сказаць, ці гэта вынік няспыннай ментальнай працы і ўдасканалення сродкаў спажціжэння экзістэнцыяльнай сутнасці свету, ці адна з праяваў шматграннага жыцця, ад якой нельга схавацца ці збегчы. "Смерць заўсёды больш надзейная за каханне", як геніяльна адзначыў Габрыэль Гарсія Маркес і, дададзім, уласна жыццё, а адзінота, у сваю чаргу, больш надзейная і моцная за ўсе пачуцці і праявы быцця.

Праз увесь трыпціх "Стах" Барыса Пятровіча праходзіць ідэя асуджанасці на адзіноту. Аўтар даводзіць думку аб тым, што памяць, сон, мары, любоў ды каханне і нават само жыццё ёсць праявы гэтага стану: "Памяць – прамежак часу ад адзіноты ў лоне да адзіноты ў труне" [1, с.7].

Герой трыпціха здолеў адчуць усе праявы адзіноты. З нараджэння гэтае пачуццё жыло ўнутры яго. Адзінокім ён быў, калі жыў у маленькай вёсачцы, і застаўся такім, а можа стаў яшчэ больш самотным, калі пераехаў у горад. Працэс урбанізацыі не



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

пакідае чалавеку выбару: шэрыя блокі спальных раёнаў, неонавыя шыльды гіпермаркетаў, натоўпы людзей, якія шукаюць асабістага шчасця – усё гэта нараджае адзіноту. Барыс Пятровіч уздымае невырашальнае пытанне: чаму часцей за ўсё чалавек адчувае сябе ў вакууме пасярод тлуму і мітусні і “можа не заўважаць адзіноты ў пустым доме на востраве за тысячу кіламетраў ад бліжэйшага жытла” [1, с. 11]. Аўтар таксама адзначае, што “адзінокі можа быць шчаслівым толькі тады, калі ня ведае, што недзе ёсьць іншыя людзі” [1, с. 12]. Таму што чалавек з’яўляецца “статкавай” істотай, і яго на падсвядомым узроўні неадольна цягне да сабе падобных. У выніку асоба спрабуе забыць пра адзіноту і тым самым прыпадабняецца да іншых, губляе сваю адметнасць, бо чалавек геніяльны ў сваей унікальнасці. Стах, герой трыпціха, раптам разумее, што ён супрацiўляўся адзіноце пры дапамозе кахання да зямных жанчын, і таму не можа быць геніем, бо “геній – гэта пустацвет. Геній – гэта найпрыгажэйшая кветка, якая ярка цвіце, аднак не дае пладоў. Геній не дае працягу: ён – вянец” [1, с. 44]. І калі аднаму наканавана знайсці шчасце ў каханні, то іншаму – аддаць сябе мастацтву, каб яго творы зрабіліся медыумам паміж яго душой і чалавецтвам. Бо “людзі такія непадобныя між сабою: тое, што камфортна аднаму – раздражняе другога” [1, с. 11].

Феномен адзіноты цяжка разгадаць. Барыс Пятровіч сцвярджае, што адзінота – гэта невылечная хвароба. І ніхто не ведае, ці пазбаўляе смерць чалавека ад адзіноты, ці, наадварот, набліжае да яе. А, можа, смерць і ёсць адзінота, усёпаглынальная, вялікая, крыштальнай чысціні, якая знаходзіцца ў канцэнтраваным выглядзе па-за межамі жыцця.

Аўтар таксама прыходзіць да высновы, што ў свеце няма нічога нязменнага, акрамя адзіноты, таму «самае доўгае шчасце можа ня даць шчасця, а самае доўгае гора ня быць горам» [1, с. 24]. У свеце ўсё хутка змяняецца, і чалавек вымушаны падпарадкоўвацца зменам, прыстасоўваць сваё ўласнае жыццё да агульнага жыцця планеты. І чым больш спазнае, спасцігае чалавек, тым больш адчувальным становіцца пачуццё адзіноты. Барыс Пятровіч праводзіць свайго героя праз усю гаму пачуццяў і станаў. У другой частцы трыпціха герою была дадзена магчымасць праверыць моц свайго духу: прайсці праз дворыкі з рознымі выпрабаваннямі – не ў сне ці віртуальна, а адчуць усё фізічна. Кожнаму дворыку адпавядае пэўная нота музычнай гамы, у якой з кожнай нотай гук робіцца больш высокім, пранікальным.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У першым дворыку Стах трапіў да катаў, якія лупцавалі па чарзе дарослых мужчын і малых дзяцей. Людзі ішлі адзін за адным да плахі, на якой яны маглі адчуць не фізічны боль, а горыч і прыкрасць успамінаў. Перад вачыма Стаха прамільгнулі непрыемныя моманты жыцця. Але не тыя, якія ўтрымліваліся ў памяці, а забытыя. Апошнія і былі самымі балючымі. Герой раптам зразумеў, што ўсе няздзейсненыя надзеі, ягоныя асабістыя пралікі адбіліся на лёсах іншых людзей. Гэтае выпрабаванне было дадзена Стаху, каб ён назаўсёды развітаўся з мінулым і каб у яго засталася толькі віна, «чыстая віна, невядома за што і перад кім» [1, с. 54].

У другім дворыку, настрою якога адпавядае нота «рэ», Стах адчувае здзек над сваім гонарам. Але ён вытрымаў, не скарыўся. Бо, калі зробіш тое, што ад цябе патрабуюць, пойдзеш супраць сваёй волі – станеш такім, як усе, застанешся ў гэтым дворыку назаўсёды. На астатніх нотах гамы Стах ператварыўся ў жанчыну, бо мужчынам і жанчынам заўсёды хацелася памяняцца месцамі. Герой не схлусіў, каб застацца жывым і не скарыўся лёсу, ні ў благіх абставінах, ні ў добрых, «бо ведаў: вытрываць любое выпрабаванне можа толькі той, у каго ёсць вялікая мэта, дзеля якой ён жыве...» [1, с. 55]. І на апошняй ноце Стах адчыняе дзверы з надпісам «Смерць», таму што ў гэта паняцце ўключаны шчасце, гора, страх, багацце, боль, радасць, каханне. Але герой не памірае, ён працягвае жыць, думаць, адчуваць. Таму што гэтыя дзверы сталі сродкам, каб «раз і назаўсёды пакончыць з гэтымі пакутамі, з гэтымі выпрабаваннямі, з гэтымі вандроўкамі па дворыках...» [1, с. 66].

Аўтар даводзіць да чытача думку, што ўсё ў свеце прадстаўлена ў адзіночным ліку, у адзінкавым выглядзе. Таму і адзінота – з'ява спецыфічная, унікальная, як адбіткі пальцаў. Не існуе адзіноты агульнай, грамадскай, ёсць адзінота прыватная, якая належыць толькі адной асобе, і ніхто не прыдумаў лекаў ад гэтай невылечнай хваробы быцця.

1. Барыс Пятровіч Шчасце быць... Трыпціх, аповесьці, апавяданні, мроі. – Мн.: УП "Тэхнапрынт", 2004. – 576 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ